ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ

УДК 636.2.083:612.8

В. І. ШЛЯХТУНОЎ, А. Ф. ТРАФІМАЎ, Д. М. ХАДАСОЎСКІ

ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ СПАЛУЧЭННЯ ПЕРАГРУПОЎКІ ЖЫВЁЛ ПА ЭНЕРГІІ РОСТУ З АНТЫСТРЭСАВАЙ ПРАФІЛАКТЫКАЙ

Асноўныя страты прадукцыі пры вытворчасці ялавічыны на прамысловых комплексах звязаны з парушэннямі ў кармленні і ўтрыманні жывёлы, недахопамі ў тэхналогіі, неаднароднасцю маладняку па раду прыкмет (узрост, жывая маса, рэзістэнтнасць і г. д.). Усё гэта з'яўляецца прычынай вялікага разрыву паміж генетычным патэнцыялам жывёл і яго фактычнай рэалізацыяй, што даволі часта назіраецца ва ўмовах комплексаў [2—4].

З умацаваннем кармавой базы гаспадарак, паляпшэннем санітарна-гігіенічнага стану жывёлагадоўчых комплексаў стварэнне тэхналогіі, якая найбольш поўна адпавядае біялагічным асаблівасцям жывёл, стане асноўным фактарам у павышэнні мясной прадукцыйнасці маладняку буйной рагатай жывёлы. Сучасныя тэхналагічныя рэжымы на комплексах закрытага тыпу прадугледжваюць рад аперацый, якія выклікаюць вострыя стрэсавыя рэакцыі ў жывёл. Да іх адносяцца каўдаэктамія, абязрожванне, узважванне і г. д. Распрацоўка спосабаў, якія дазваляюць пераадолець або значна знізіць адмоўны ўплыў гэтых стрэсфактараў на рост бычкоў, мае вялікае практычнае значэнне [1].

У існуючых тэхналагічных схемах па вытворчасці ялавічыны недастаткова ўлічваецца індывідуальны генетычны патэнцыял бычкоў, што стрымлівае павелічэнне вытворчасці мяса. Вядома, што жывёлы істотна адрозніваюцца паміж сабой па энергіі росту і здольнасці выкарыстоўваць пажыўныя рэчывы рацыёну. У працэсе гадавання маладняку розная энергія росту, абумоўленая рознымі ўзроўнем і інтэнсіўнасцю абменных працэсаў, прыводзіць да парушэння аднароднасці груп. Ва ўмовах комплексаў адрозненні па жывой масе паміж жывёлінамі ў стойле дасягаюць 77—135% [5]. Жывёліны, якія адсталі ў росце, знаходзяцца ў стане працяглага хранічнага стрэсу, што рэзка зніжае іх прадукцыйнасць і выводзіць з вытворчага працэсу. Перагрупоўка бычкоў з улікам энергіі росту на пэўнай стадыі вырошчвання дазваляе пры адпаведным узроўні кармлення больш поўна праявіць індывідуальны генетычны патэнцыял мясной прадукцыйнасці жывёл. Важным з'яўляецца вывучэнне

Табліца 1. **Схема навукова-гаспадарчага доследу**

Нумар групы	Колькасць галоў	Антыстрэсавыя апрацоўкі	Перагрупоўка
I	30	няма	няма
II	90	няма	ёсць
III	30	ёсць	няма
IV	90	ёсць	ёсць